УДК 811.’38:821’0

В. У. Русак, канд. філал. навук, выкладчык (БДТУ)

# СТЫЛІСТЫЧНАЯ РОЛЯ ПЕРЫЯДУ Ў МОВЕ МАСТАЦКАЙ ЛІТАРАТУРЫ (НА МАТЭРЫЯЛЕ ПРОЗЫ ЯНКІ СІПАКОВА)

Артыкул прысвечаны аналізу стылістычнага выкарыстання перыяду як тыповага экспрэсіўнага сродку ў прозе сучаснага беларускага пісьменніка Янкі Сіпакова. Адзначаецца, што стылістычная функцыя перыяду залежыць ад семантычнага напаўнення канструкцыі і ад кантэксту. Праілюстраваны выпадкі ўжывання перыяду для павышэння эмацыянальнасці выказвання, стварэння лірычнага, паэтычнага настрою, а таксама для актуалізацыі замаруджанасці ці, наадварот, дынамікі падзей.

The article covers the analysis of stylistics using of the period as a typical expressive means of the prose of modern belarusian writer Yanka Sipakov. It’s marked that a stylistic function of the period depends on a semantic filling of the construction and a contex. The cases of this period’s using were illustrated to rise the emotionality of the utterance, to create a lyrical and poetical mood, and to show the dormancy or, on the contrary, dynamics of the events.

**Уводзіны.** Адной з асноўных уласцівасцей мовы мастацкага твора выступае экспрэсіўнасць. Гэта абумоўлена сумяшчэннем у камунікатыўнай пазіцыі мастака слова некалькіх пачаткаў: імкненнем паведаміць пра пэўныя падзеі і з’явы, рэалізаваць свае эмоцыі, перажыванні і ўздзейнічаць на адрасата. Выступаючы сродкамі фарміравання мастацкіх вобразаў, элементы мовы рознага ўзроўню (фанетычнага, лексічнага, сінтаксічнага і інш.) у мастацкім кантэксце набываюць дадатковыя значэнні, уздзейнічаюць на псіхаэмацыянальную сферу чытача, далучаючы яго да супольнай з пісьменнікам творчасці. Пры гэтым камунікатыўная функцыя мовы зліваецца з эмацыянальнай, вобразна-выяўленчай, эстэтычнай.

Тэарэтыкі мовы мастацкай літаратуры ўстанавілі, што ўплыў на канчатковае вербальнае фарміраванне мастацкай думкі аказвае сінтаксічная арганізацыя тэксту. Так, акадэмік В. У. Вінаградаў адзначаў, што «ў некаторых выпадках асаблівасці сінтаксічных аб’яднанняў служаць сродкам стварэння новых семантычных нюансаў» [1, с. 6]. Д. М. Шмялёў пісаў, што менавіта «ў інтанацыйна-сінтаксічнай структуры тэксту знаходзіць сваё канчатковае выражэнне як агульная функцыянальная накіраванасць маўлення, так і стылістычная значнасць адзінак, што яго складаюць» [2, с. 137]. Даследчыца А. К. Юрэвіч падкрэслівала, што «сінтаксіс мае неабмежаваныя магчымасці для выражэння думак і пачуццяў» [3, с. 196].

Развіццё сучаснай беларускай мовы суправаджаецца інтэнсіўнай актывізацыяй канструкцый, якія маюць на мэце максімальна актуалізаваць змешчаную інфармацыю, з тым каб звярнуць на яе большую ўвагу, узмацніць практычную дзейнасць. Сярод стылістычных фігур, якія набылі асаблівае распаўсюджанне ў беларускай літаратурнай мове, даследчыкамі справядліва адзначаецца перыяд.

**Асноўная частка.** Перыяд (гр. periodos – кругазварот, абход) – сінтаксічная канструкцыя, якая выражае разгорнутую, цэласную думку і дзеліцца паўзай у сэнсава-інтанацыйных адносінах на дзве часткі: павышэнне (*пратазіс*), у якім, як правіла, пералічваецца шэраг аднародных адзінак і якое вымаўляецца з павышэннем голасу, і паніжэнне (*аподозіс*), якое сэнсава, граматычна і інтанацыйна заключае першую частку і вымаўляецца з паніжэннем голасу: ***Якія** птушкі весялілі беларускія лясы, **якія** краскі радавалі беларускія лугі, **якія** крыніцы давалі сілу беларускай зямлі, **з чаго** беларус піў квас, **у што** абуваўся, **як** праводзіў ён свой вольны час, якога ў яго заўсёды было да крыўднага мала, – пра ўсё гэта, прачытаўшы ўважліва Коласа, можа даведацца нават і той, хто ніколі не быў у Беларусі* (Я. Сіпакоў. Свята на кожны дзень).

У сінтаксічных адносінах перыяд, як правіла, адпавядае **простаму ўскладненаму ці складанаму сказу**: *Толькі пішучы пра свой народ, толькі разумеючы свой народ, толькі падымаючы свой народ, толькі даючы яму слова і магчымасць выказацца, – можна стаць сапраўдным, патрэбным народу пісьменнікам* (Я. Сіпакоў. Як птушкі ў лёце); ***Ці** то пракладае ён першую баразну ў яшчэ не прасохлай, а таму чорнай і ліпкай зямлі; **ці** то смела даручае такое кволае і такое нежывое яшчэ зерне ўгрэтаму ўжо і так паласкавеламу ад сонца полю; **ці** то любуецца, як дымна красуе, а потым пругка налівае зялёны колас, – заўсёды хлебасей бачыць перад сабою толькі вось такі даспелы прастор; ужо тады, вясною і летам, ён чакае таго моманту, калі, раскусіўшы вылушчанае зерне, можна самому сабе сказаць: пара!* (Я. Сіпакоў. Даверлівая зямля).

У творах мастацкай літаратуры перыяд можа ўжывацца з рознымі мэтамі, усё залежыць ад яго сэнсавага напаўнення і кантэксту. Багаты матэрыял для аналізу стылістычнага выкарыс-

тання перыяду дае проза Янкі Сіпакова, у якой гэтая фігура выступае як тыповы стылістычны сродак. Найбольш распаўсюджаны перыяды ў лірычных нарысах і аповесцях Янкі Сіпакова. Да прыкладу, у нарысе «Акно, расчыненае ў зіму» выяўлена 6 перыядаў, у «Паштоўках у Кіеў» іх 5, аповесць «Даверлівая зямля» змяшчае 3 перыяды, «Усе мы з хат» – 5.

Па сваёй прыродзе перыяд характарызуецца прыналежнасцю да эмацыйна-экспрэсіўнага кніжнага маўлення. Дзякуючы своеасаблівай форме з яе дакладным, на першы погляд нават штучным размяшчэннем аднолькавых кампанентаў, гэтая стылістычная фігура дае магчымасць перадаваць аўтарскую эмфатычную ўсхваляванасць, выяўляць неабыякавыя адносіны, захапленне ці абурэнне і г. д.: *Вырошчваць у чалавеку дабрыню, прыгажосць, асуджаючы і выкрываючы зло, радуючыся, смеючыся, задумваючыся, плачучы, скрыгочучы зубамі, лашчачы вачыма, любуючыся, злуючыся, хвалюючыся, але абавязкова вырошчваць дабрыню, – што можа зраўняцца з гэтаю звышзадачаю кожнага сапраўднага твора?!* (Я. Сіпакоў. Наталенне смагі). Сінтаксічна аднародныя элементы першай часткі перыяду сваім лексічным зместам і інтанацыйным афармленнем дазваляюць трымаць чытача ў напружанні, якое паступова нарастае і спадае толькі ў канцы сказа. Своеасаблівая форма перыяду дазваляе больш яскрава паказаць эмацыянальную пазіцыю аўтара, яго ўсхваляванасць, неабыякавыя адносіны да выказанага.

Рытмічнасць, меладычнасць перыядаў, якая з’яўляецца вынікам своеасаблівага, аднатыпнага афармлення іх кампанентаў, садзейнічае перадачы паэтычнага настрою ў многіх творах Янкі Сіпакова. Так, перыяд арганічна ўваходзіць у кампазіцыю нарысаў, аўтабіяграфічных аповесцей, дзе ўдала перадае разважанні, роздум аўтара: ***І якая б*** *сабе на вуліцы ні была непагадзь,* ***і які б*** *сабе дождж ні барабаніў у тваё цёмнае і заплаканае восеньскае акно,* ***і які б*** *у цябе ні быў паганы настрой,* ***і хто б*** *цябе ні пакрыўдзіў так, што, здаецца, ад абразы зненавідзіш усю зямлю і ўсіх людзей на ёй, але ўсё роўна, як трывожна і радасна заб’ецца сэрца, калі ты пасля доўгай ростані са сваім пісьмовым сталом, зноў сядзеш за яго <...>* (Я. Сіпакоў. Як птушкі ў лёце). Сінтаксічны паралелізм кампанентаў павышэння ў гэтым перыядзе інтымізуе маўленне пісьменніка, падкрэслівае яго лірычны характар. Форма перыяду перадае думку ў яе дынаміцы, развіцці, дазваляе паказваць прычыны, вынікі і абставіны, пры якіх яна з’явілася.

Асаблівую стылістычную нагрузку набывае перыд-лірычнае адступленне ў канцы твора, бо ён вылучае на першы план галоўную думку аўтара: *Я глядзеў на іх і, нібы падтакваючы Паўлу, Караньковічу, думаў, што, і праўда, усе мы з хат:* ***і вось гэты*** *мой сусед – гаваркі дзядзька, які спяшаецца на вяселле;* ***і вось гэтая*** *цётка, якая едзе ў Віцебск жаніць пляменніка на дачцэ капітана;* ***і вось той*** *паважны мужчына ў капелюшы, які глядзіць у акно і, здаецца, не прымае ніякага ўдзелу ў гаворцы <...>;* ***і вось гэтая*** *модная, расфарбаваная не па гадах жанчына, якая сядзіць побач з музыкавай жонкаю і ўсё адсоўваецца ад бабулі <...>;* ***і вось гэтая*** *Цытнячышына Люська, што, як напалоханы верабейка, ціхенька прыклеілася на крайку сядзення – па часе яна стане добрым спецыялістам і, магчыма, вернецца назад у азярычынскую бальніцу, – усе яны таксама з хат* (Я. Сіпакоў. Усе мы з хат). Прыведзены перыяд знаходзіцца амаль у самым фінале аповесці «Усе мы з хат», пасля яго ідуць толькі чатыры невялікія сказы. Выкарыстанне «перыядычнага маўлення» ў заключэнні матывавана глыбокім зместам, вялікай ідэйна-мастацкай нагрузкай канцоўкі твора. Перыяд узмацняе патэтычнае гучанне заключнай часткі, падсумоўвае роздум пісьменніка і робіць аўтарскія высновы галоўнай думкай усяго твора.

Як адзначае даследчыца А. А. Акішына, «перыядычная форма маўлення незалежна ад месца і мэты ўжывання заўсёды ўносіць у паведамленне сваё асноўнае стылістычнае гучанне: праяўленне адзінства ў разнастайным» [4, с. 34]. Менавіта таму форма перыяду надзвычай падыходзіць там, дзе неабходна развіць складаную па змесце думку. Сінтаксічны паралелізм, які выступае структурнай асновай большасці перыядаў, дазваляе аб’яднаць факты, паказаць мноства з’яў, падзей, учынкаў у іх узаемасувязі. Адметную ролю такія разгорнутыя канструкцыі выконваюць у абсалютным пачатку твора: указваючы на час, месца і разнастайныя ўмовы развіцця асноўнай сюжэтнай лініі, яны ствараюць фон, на якім адбываецца завязка асноўнага дзеяння. Як слушна ўказваў А. М. Карпаў, «гэтым перыяды-экспазіцыі падобныя да аўтарскіх рэмарак, пашыраных у драматычных творах» [5, с. 78].

Яскравым прыкладам перыяду-экспазіцыі з’яўляецца пачатак апавядання Янкі Сіпакова «Трава ў расе»: ***Калі*** *разышліся нарэшце госці,* ***калі*** *з музыкаю пайшоў дадому, у суседнюю вёску, Мяходзька-гарманіст, павёўшы за сабою і зарэчанскіх баб – праз расчыненыя вокны ў хаце доўга было чуваць, як яны спявалі, ідучы па лузе, як потым смяяліся, па хісткай кладцы пераходзячы рэчку;* ***калі****, ужо развітаўшыся, заблудзіўся неспадзявана ў чужым двары сусед, шафер Грыша Шчамель, які выбіраўся з хаты амаль апошнім, крычаў там, як рэзаны: «Баба Вера, адчыняй хутчэй вароты!», грукаўся ў хлеў да каровы, аж пакуль урэшце не выйшаў Дзіма і не завёў яго дадому;* ***калі*** вярнуўся назад

*Дзіма і, смеючыся, расказаў, як Грыша не пазнаў свае хаты, усё пытаўся: «Куды гэта ты мяне, Андрэевіч, прывёў?», і толькі калі выбегла Люба, Грышава жонка – яна пайшла дадому раней: парадчыць гаспадарку, – калі строга спыталася: «Што, наліў ужо вочы?», добра штурханула ў плечы, згадзіўся: «Во цяпер я, Андрэевіч, ужо бачу, што дома»; **калі** пайшла нарэшце і Мішчыха, якая ўсе вясковыя пагулянкі заўсёды пакідае апошняю, яны засталіся траіх – Дзіма, Андрэй Паўлавіч і яна, баба Вера, ці, як усе яе завуць тут, у вёсцы, Лётчыха – віноўніца сённяшняга свята.* Абраная сінтаксічная канструкцыя дазволіла пісьменніку ў эканомнай форме паведаміць пра шэраг падзей і ўчынкаў, якія папярэднічалі асноўнаму дзеянню. Разгорнутыя кампаненты павышэння, ускладненыя адначасова аднароднымі і адасобленымі членамі, устаўнымі канструкцыямі, дадзенымі часткамі, простай мовай, дазволілі выказаць думку найбольш дакладна, дэталёва, стварыць сказ-апавяданне. Калі парушыць выкарыстаную аўтарам структуру, пераўтварыць яе ў кантэкстуальную групу сказаў, то інтэнсіўны выклад саступіць месца плаўнаму паведамленню, а гэта непажадана, бо апісаныя падзеі не асноўныя ў апавяданні, яны толькі ствараюць бытавы фон, неабходны для завязкі асноўнага дзеяння.

Разгорнутая структура перыяду надзвычай прыдатная тады, калі неабходна падкрэсліць дынамічнае працяканне падзей: ***Пакуль** я шукаў брыгадзіра, аднаногага Дзямідзьку, якому ў партызанах у час блакады адарвала нагу; **пакуль** ён, топчучы мокраю ад нізу дзеравяшкаю снег, доўга думаючы перад гэтым – вырашаючы, якога каня мне даць, – дазволіў узяць нарэшце кульгавага Шнэля, адбітага ў немцаў жарабка, які вазіў потым салдацкую кухню і якога пасля ранення, калі наступалі, нашы салдаты пакінулі ў Сябрыні; **пакуль** я дачакаўся Халадзёнка, які загадваў усёю вупражжу; **пакуль** запрагаў; **пакуль**, пад'ехаўшы пад Рагатунову хату, чакаў Рамана, які хоць і неахвотна, але ўсё ж згадзіўся з'ездзіць са мною ў дровы, – раніца троху пасвятлела, але пакуль не саступіла дарогу дню: снег, хоць і белы, яшчэ цьмяна, нібы воблакі, нашатырыўшыся ад марозу, шарэў на вуліцы, на стрэхах...* (Я. Сіпакоў. Крыло цішыні).

Аднак выяўлены і асобныя выпадкі, калі перыяд-апавяданне, наадварот, перадае запаволенасць, працягласць дзеяння: *Расхінаючы голле, адводзячы яго ўбок адною рукою – другая была занятая: раменьчык, які трымаў на плячы цяжкую модную сумку, парваўся і яе давялося ўзяць за ручкі, – ён **паторкаўся** сюды-туды па непраходным, нібы знарок сплеценым падлеску, **перайшоў** па зваленым кімсьці дрэве невялікі, але таксама дужа зарослы ручай – алешына ляжала тут, відаць, даўно, яна паспела ўжо абсохнуць, абшалушыцца і шупла спружыніла, і ён адно баяўся, каб хоць не пераламалася, – **пацягаўся** па маліннiках, што, высокія і калючыя, да крыві абдзіралі рукі, чапляліся не толькі за штаны, але нават і за пінжак, **паблукаў** па сапраўдных зарасніках майніку, які, нягледзячы на дажджы, што, па ўсім відаць, не абыходзілі сёлета і гэты паўночнаяловы край, быў брудна-шэры і, патрывожаны чаравікамі, дужа пыліў, – словам, чалавек кідаўся ва ўсе бакі, але, хоць і ведаў, што поле недзе блізка, ніяк не мог выйсці з кустоў* (Я. Сіпакоў. Свята). У гэтым выпадку пісьменнік карыстаецца інтанацыйнай і структурнай аднатыпнасцю перыяду для стварэння аднастайнага малюнка, каб падкрэсліць, што чалавек заблудзіўся і доўга не мог знайсці патрэбнай яму дарогі.

**Заключэнне.** Такім чынам, перыяд як сродак экспрэсіўнага сінтаксісу характарызуецца структурнай і функцыянальнай разнастайнасцю. Ён ужываецца ў творах рознага жанру і дазваляе падкрэсліваць эмацыянальнасць паведамлення, надаваць выказванню ўрачысты дэкламацыйны характар, перадаваць лірычны, паэтычны настрой сказанага, дае магчымасць у эканомнай форме перадаваць максімальную інфармацыю і тым самым запавольваць ці дынамізаваць паведамленне, характарызаваць пэўны адрэзак часу з пазіцыі яго насычанасці падзеямі.

## Літаратура

1. Виноградов, В. В. О языке художественной прозы: избр. тр. / В. В. Виноградов. – М.: Наука, 1980. – 360 с.

2. Шмелёв, Д. Н. Русский язык в его функциональных разновидностях: к постановке проблемы / Д. Н. Шмелёв. – М.: Наука, 1977. – 168 с.

3. Юрэвіч, А. К. Стылістыка беларускай мовы: вучэб. дапаможнік / А. К. Юрэвіч. – 2-е выд., перапрац. і дап. – Мінск: Выш. шк., 1992. – 288 с.

4. Акишина, А. А. Период как синтаксико-стилистическая категория современного русского языка / А. А. Акишина. – Львов: Изд-во Львов. ун-та, 1958. – 39 с.

5. Карпов, А. Н. Стилистические функции периодов в произведениях Л. Н. Толстого / А. Н. Карпов // Ученые записки / Рязан. гос. пед. ин-т. – М., 1967. – Т. 56. – С. 74–88.

*Паступіў 02.04.2010*